Чацвер, 17 Снежань 2020

Паўтары гады – за «вырадка». За што ў Гарадку асудзілі рабочага Мікалая Чарняўскага

Друкаваць (/news/sud/item/3833-pautary-gady-za-vyradka?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=47d3433b66903e7d15991e1a5b40fba1b5d65b8c)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/9ab257875e071eb99bbac5fecacacf3b_XL.jpg)

Мікалай Чарняўскі, фота: vk.com

15 снежня суд Гарадоцкага раёну прысудзіў 33-гадоваму Мікалаю Чарняўскаму паўтары гады калоніі агульнага рэжыму за пагрозы і абразу супрацоўніка МУС. Мужчына быў прызнаны вінаватым паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады») і арт. 365 КК («Умяшанне ў дзейнасць супрацоўніка ўнутраных спраў»). Вырак агучыў суддзя Аляксандр Ляшковіч.

Як раней паведамляла дзяржагенцтва БелТА (https://www.belta.by/incident/view/zhitelju-gorodka-dali-15-goda-kolonii-za-ugrozy-i-oskorblenie-militsionera-420286-2020/), паводле следства, 22 жніўня **Мікалай Чарняўскі**

пакінуў у адным з Тэлеграм-каналаў каментар, у якім абразіў супрацоўніка міліцыі, а таксама пагражаў апублікаваць ягоныя асабістыя дадзеныя.

Маці асуджанага **Людміла** ў размове з «Віцебскай Вясной» запэўніла, што ніякіх пагрозаў яе сын у інтэрнэце не выказваў і ў дзейнасць супрацоўніка не ўмешваўся, а што да знявагі, была ўжытая фраза *«ур...д в погонах»*.

> *«І гэта было не наўпрост сказана, а ў размове з кімсьці ў чаце. Без аніякіх мацюкоў. На судзе Мікалай шчыра прасіў прабачэння за гэтыя словы. А той пацярпелы супрацоўнік кажа: «Як чалавек я табе прабачаю, але як міліцыянт – не»*, – расказала маці асуджанага.

Яна таксама паведаміла, што пацярпелы прасіў суд задаволіць пазоў аб кампенсацыі за маральную шкоду – 500 рублёў. Гэтую суму яму заплацілі яшчэ да абвяшчэння прысуду.

> *«Прасілі яго, ледзь не на каленях прасілі, каб дараваў. Спачатку была нейкая надзея… Цяпер я не веру ні ў што…»* – кажа маці Мікалая Чарняўскага.

Маці: Не ведаю, як я без яго жыць буду...

Паводле спадарыні Людмілы, сваю віну яе сын цалкам прызнаў і раскаяўся. У апошнім слове казаў, што гатовы прыняць любое пакаранне, але прасіў каб не пазбаўлялі волі. Вердыкт суддзі **Аляксандра Ляшковіча** (ён жа – старшыня Гарадоцкага райсуду): **паўтары гады зняволення** ў калоніі агульнага рэжыму.

> *«Я не ведаю, як я без яго жыць буду...»* – кажа маці асуджанага. Яна працуе настаўніцай і жыве разам з 77-гадовай мамай, бабуляй Мікалая. Прызнаецца: каб аплаціць адваката, была вымушаная прадаць усе свае залатыя ўпрыгожанні…

Мікалаю Чарняўскаму 33 гады. Раней ён працаваў рабочым у вайсковай частцы, апошнія некалькі гадоў працаваў неафіцыйна. Жыў з маці і бабуляй. Першы раз быў затрыманы ў кастрычніку на 72 гадзіны, другі раз – у лістападзе. Ужо месяц як знаходзіцца пад вартай у СІЗА-2 Віцебску.

Прысуд не набыў законнай моцы. Па словах маці, пастанова Гарадоцкага райсуду будзе абскарджаная ў Віцебскім абласным судзе.

Зміцер Міраш

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: Гарадок (/itemlist/tag/Гарадок) Аляксандр Ляшковіч (/itemlist/tag/Аляксандр%20Ляшковіч) артыкул 369 КК (/itemlist/tag/артыкул%20369%20КК) артыкул 365 КК (/itemlist/tag/артыкул%20365%20КК)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Два гады пазбаўлення волі – за замахванне гумавым дручком у бок міліцыянта (/news/sud/item/3832-dva-gady-pazbaulennya-voli) Дзмітрыя Кулакова з Шуміліна асудзілі на

тры з паловай гады «хіміі» за пагрозы і абразу маёра міліцыі » (/news/sud/item/3834-try-z-palovaj-gady-khimii)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3833-pautary-gady-za-vyradka#startOfPageId3833)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https[illegible]